**Дыдактычныя гульні ў дзіцячым садзе**

З М Е С Т

Роля дыдактычных гульняў ……………………………………………….3

Кіраўніцтва дыдактычнымі гульнямі ……………………………………….12

Планаванне гульняў ………………………………………………………….19

Азнаямленне дашкольнікаў з наваколлем ………………………………….23

Навучанне роднай мове ……………………………………………………….38

Развіццё вуснай мовы ……………………………………………………..--

Навучанне грамаце ………………………………………………………….53

Азнаямленне з элементарнымі матэматычнымі ўяўленнямі …………………68

Значэнне і месца дыдактычных гульняў у самастойнай дзейнасці дзяцей …80

Дадатак ………………………………………………………………………………..90

Рэкамендуемая літаратура ……………………………………………………….110

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## РОЛЯ ДЫДАКТЫЧНЫХ ГУЛЬНЯЎ

Дыдактычныя гульні – адзін са сродкаў выхавання і навучання дзяцей дашкольнага ўзросту.

Вялікі ўклад у рспрацоўку савецкай тэорыі гульні ўнесла Н.К. Крупская. Яна пісала што гульня для дзяцей “… вучоба, гульня для іх – праца, гульня для іх – сур’ёзная форма выхавання.

Гульня для дашкольнікаў – спосаб пазнання наваколля. Гуляючы, ён вывучае колеры, форму, уласцівасці матэрыялаў, прасторавыя адносіны,

лікавыя адносіны ,вывучае расліны, жывёл”. У гульні дзіця равіваецца фізічна, прывучаецца пераадольваць цяжкасці. У яго выхоўваецца емлівасць, знаходлівасць, ініцыятыва. Н.К. Крупская адзначае, што набываць веды можна не толькі седзячы над кнігай, а праз гульню, якая дапамагае дзецям пазнаць жыццё, пазнаць саміх сабе.

“Праграма выхавання і навучання ў дзіцячым садзе” прад’яўляе к дыдактычным гульням вялікія патрабаванні: “Пры дапамозе гульняў, у прыватнасці дыдактычных, выхавальнік ажыццяўляе сенсорнае выхаванне дзяцей, развівае пазнавальныя працэсы. Ён выкарыстоўвае гульню як сродак развіцця мыслення, памяці, пашырэння і замацавання ўяўлення аб навакольным жыцці”.

У тэорыі і практыцы дашкольнага выхавання існуе наступная класіфікацыя дыдактычных гульняў:

а) з цацкамі і іпракметамі;

б) настольна-друкаваныя;

в) слоўныя.

Характэрная асаблівасць дыдактычных гульняў заключаецца ў тым, што яны ствараюцца з мэтай навучання і выхавання дзяцей. Аднак створаныя ў дыдактычных мэтах, яны застаюцца гульнямі. Дзіця ў гэтых гульнях прыцягвае перш за ўсё гульневая сітуацыя, а, уключыўшыся ў гульню, яно непрыкметна для сябе рашае дыдактычную задачу.

Кожная дыдактычная гульня ўключае ў сябе некалькі элементаў, а іменна: дыдактычную задачу, змест, правілы і гульнёвыя дзеянні.

Асноўным элементам дыдактычнай гульні з’яўляецца дыдактычная задача. Усе астатнія элементы падпарадкаваны гэтай задачы і забяспечваюць яе выкананне.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Калі прааналізаваць дыдактычныя гуьні з пункту погляду таго, што ў іх цікавіць дзяцей, то выявіцца, што дзяцей цікавіць перш за ўсё гульнёвае дзеянне. Яно стымулюе дзіцячую актыўнасць, выклівае ў дзяцей пачуццё задавальнення. Дыдактычная задача, завуаліраaная ў гульнёвую форму, рашаецца дзіцем больш паспяхова, паколькі яго ўвага перш за ўсё накіравана на разгортванне гульнёвая дзеяння і выкананне правіл гульні. Нерпыкметна для сябе, без асобага напружання яно выконвае дыдактычную задачу.

У кожнай дыдактычнай гульні дыдактычныя задачы, гульнёвыя дзеянні і правілы ўзаемазвязаны.

Дыдактычныя гульні садзейнічаюць фарміраванню ў дзяцей псіхічных якасцей: увагі, памяці, назіральнасці, кемлівасці. Яны вучаць дзяцей прымяняць набытыя веды ў розных гульнёвых  умовах, актывізуюць разнастайныя разумовыя працэсы і прыносяць эмацыянальную радасць дзецям.

Дыдактычныя гульні адзейнічаюць эстэтычнаму выхаванню, развіццю творчай фантазіі, яркай перадачы вобраза.

Дыдактычныя гульні – незаменны сродак навучання дзяцей пераадоленню розных цяжкасцей у разумовай і маральнай дзейнасці. Гэтыя гульні тояць у сабе вялікія магчымасці і выхаваўчага ўздзення на дзяцей дашкольнага ўзросту.

## РЭКАМЕНДУЕМАЯ ЛІТАРАТУРА

Бондаренко А.К. Дидактические игры в детском саду. – М., 1985.

Дрязгунова В.А. Дидактические игры для ознакомления дошкольников с растениями. --М., 1981.

Максаков А.И., Тумакова Г.А. Учите, играя. – М., 1983.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Методические рекомендации к «Программе воспитания и обучения в детском саду» // Дошкольное воспитание. – 1986. - № 8. – С. 6 – 8.

Михайлова З.А. Игровые занимательные задачи для дошкольников. – М., 1985.

Руководство играми детей в дошкольных учреждениях. – М., 1986.

Сорокина А.И. Дидактические игры в детском саду. – М., 1982.

Швайко Г.С. Игры и игровые упражнения для развития речи. – М., 1983.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ